2. Грузіцкі Ю. Л. Абвастрэнне супярэчнасцей паміж вядучымі краінамі свету. Пачатак Другой сусветнай вайны. Вызваленне Заходняй Беларусі і яе аб’яднанне з БССР // Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): Вучэб. дапам. / В. І. Галубовіч, З.В. Шыбека, Д. М. Чаркасаў і інш.; пад рэд. В. І. Галубовіча і Ю. М. Бохана. Мінск: Экаперспектыва, 2005. С. 409–424.
3. Договор о передаче Литовской Республике города Вильно и Виленской области и о взаимопомощи между Советским Союзом и Литвой // Полпреды сообщают… Сборник документов об отношениях СССР с Латвией, Литвой и Эстонией. Август 1939 г. – август 1940 г. М. : Междунар. отношения, 1990. С. 92–98.
4. Зялінскі П. І. Аб’яднанне беларускіх зямель // Гісторыя Беларусі: дапаможнік для паступаючых у ВНУ / А. Л. Абецэдарская, П. І. Брыгадзін, Л. А. Жылуновіч і інш.; пад рэд. А. Г. Каханоўскага і інш. Мінск : Экаперспектыва, 1998. С. 382–390.
5. Кен О. Н. Москва и пакт о ненападении с Польшей (1930–1932 гг.). Санкт Петербург : Изд-во ПИЯФ РАН, 2003.
6. Ладысеў У. Ф. Беларусь у перыяд Другой сусветнай вайны. Першы этап вайны // Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. Мінск : РІВШ БДУ, 2000–2002. Ч. 2: XIX–XX стагоддзі / П.І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў, П. І. Зялінскі і інш.; рэдкал.: П. І. Брыгадзін [і інш.]. 2002. С. 439–451.
7. Мельтюхов М. И. Упущенный шанс Сталина. Советский Союз и борьба за Европу: 1939–1941 гг. (Документы, факты, суждения). 2-е изд., исправ. и доп. Москва : Вече, 2002.
8. Новик Е. К. Советский Союз и страны мира накануне и в начале Второй мировой войны // История Беларуси. С древнейших времен до 2010 г.: учеб. пособие / Е. К. Новик, И.Л. Качалов, Н. Е. Новик; под ред. Е. К. Новика. 2-е изд., испр. Минск : Выш. шк., 2011. С. 379–390.
9. Палуян У. А. Заходняя Беларусь у 1921–1939 гг. Уз’яднанне з БССР і іншыя пераўтварэнні // Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Мінск : Беларусь, 1994–1995. Ч. 2. Ад лютага 1917 да 1994 г. / М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. 1995. С. 253–264.
10. Саракавік І. А. Пачатак Другой сусветнай вайны. Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР // Саракавік І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. Мінск: Современная школа, 2006. С. 311–319.
11. Шыбека З. Цана задзіночання беларускіх земляў. Верасень 1939 – чэрвень 1941 // Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі, 1795–2002. Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. С. 298–310.

УДК [94+284+322](476)«1905/1914»

## ПРАТЭСТАНЦКІЯ ЦЭРКВЫ БЕЛАРУСІ Ў ПРАВАВЫМ І ІДЭАЛАГІЧНЫМ ПОЛІ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (1905–1914 гг.)

***А. У. Унучак***

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул, Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, andrusunuchak@gmail.com*

У артыкуле разглядаюцца змены канфесійнага заканадаўства Расійскай імперыі пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. і ўплыў гэтых зменаў на становішча пратэстанцкіх цэркваў Беларусі. Паказваецца стаўленне расійскіх уладаў і асобных прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства да баптыстаў і евангельскіх хрысціян. Устаноўлена, што напярэдадні Першай сусветнай вайны ўлады ў асноўным цікавіла стаўленне беларускіх пратэстантаў да ваеннай службы. Лічачы пратэстантаў “нядобранадзейнымі” элементамі, улады ў многі выпадках вярталіся да рэпрэсій.

***Ключавыя словы:*** *пратэстанцкая царква; Беларусь; канфесійнае заканадаўства; ваенная служба.*

## ПРОТЕСТАНТСКИЕ ЦЕРКВИ БЕЛАРУСИ В ПРАВОВОМ И ИДЕОЛОГИЧЕСКОМ ПОЛЕ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ (1905–1914 гг.)

***А. В. Унучек***

*Институт истории Национальной академии наук Беларуси, ул, Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь andrusunuchak@gmail.com*

В статье рассматриваются изменения конфессионального законодательства Российской империи после революции 1905-1907 гг. и влияние этих изменений на положение протестантских церквей Беларуси. Показывается отношение российских властей и отдельных представителей православного духовенства к баптистам и евангельским христианам. Установлено, что накануне Первой мировой войны власти в основном интересовало отношение белорусских протестантов к военной службе. Считая

протестантов «неблагонадёжными» элементами, во многих случаях власти возвращались к репрессиям.
***Ключевые слова:*** *протестантская церковь; Беларусь; конфессиональное законодательство; военная служба.*

## PROTESTANT CHURCHES OF BELARUS IN THE LEGAL AND IDEOLOGICAL FIELD OF THE RUSSIAN EMPIRE (1905-1914)

***A. U. Unuchak***
*Institute of history of the National Academy of Sciences of Belarus, Academichnajaya 1, 220072, Minsk, Belarus andrusunuchak@gmail.com*

The article discusses the changes in the confessional legislation of the Russian Empire after the revolution of 1905 - 1907. and the impact of these changes on the situation of the Protestant churches of Belarus. The attitude of the Russian authorities and individual representatives of the Orthodox clergy on the baptists and evangelical christians is indicated. It was established that on the eve of the First World War authorities were mainly interested in the attitude of Belarusian Protestants to military service. The authorities considering Protestants to be "unreliable" elements, in many cases they returned to repression.
***Key words :*** *Protestant church; Belarus; confessional legislation; military service.*

Пачатак XX ст. – час, калі расійскае канфесійнае заканадаўства пачало лібералізавацца, што дало магчымасць пратэстанцкім цэрквам у Беларусі пашырыць сваю дзейнасць. Асабліва ўлічваючы тое, што пратэстантызм і да XX ст. быў традыцыйнай для Беларусі канфесіяй. 12 снежня 1904 г. выйшаў указ "О предначертаниях к усовершенствованию государственного порядка", Гэты ўказ з'яўляўся заканадаўчым папярэднікам "Указа аб верацярпімасці" ад 17 красавіка 1905 г. Палажэнні ж указа 17 красавіка 1905 г. дазволілі свабодны пераход з аднаго хрысціянскага веравызнання ў іншае.

Паводле пункта 5 указа 17 красавіка 1905 г. усе "раскольнікі", да якіх аднеслі частку вернікаў-пратэстантаў, былі падзелены на тры групы. Крытэрыем такога падзелу выступіла ступень блізкасці іх веравучэння да праваслаўнага. Падзел быў наступны: 1. Стараабрадцы; 2. Сектанты (для нас важна, што ў гэту групу запісалі баптыстаў, евангельскіх хрысціян, штундыстаў і некаторыя іншыя дэнамінацыі); 3. Паслядоўнікі "ізуверскіх" вучэнняў. Пункт 8 згаданага ўказа дапускаў магчымасць будаўніцтва "сектанцкіх" храмаў. Пункты 9 і 10 узаконьвалі статус "духоўных настаўнікаў" "сектанцкіх" цэркваў.

Такім чынам, указ аб верацярпімасці стварыў новую прававую платформу для функцыянавання евангельскага руху ў Расійскай імперыі ў цэлым, і на беларускіх землях у прыватнасці.

У лістапалзе 1905 г. выйшла распараджэнне міністра народнай асветы, згодна з якім дзеці "сектантаў" у народных школах вызваляліся ад вывучэння Закону Божага паводле праваслаўнага канону[1, с. 256].

Нарэшце 17 кастрычніка 1906 г. выйшаў указ "О порядке образования и действия старообрядческих и сектантских общин и правах и обязанностях входящих в состав общин последователей старообрядческих согласий и отделившихся от православия сектантов". Паводле гэтага ўказа адной з умоў рэгістрацыі евангельскай царквы было зацвярджэнне яе прэсвітара губернатарам. Для рэгістрацыі царквы патрэбна было падаць у губернскае праўленне заяву з не менш чым 50 подпісамі вернікаў. Кошт маёмасці, якую набывала памесная евангельская царква мог перавышаць 5 тыс. руб. толькі з асабістага дазволу імператара. Права голасу на членскіх сходах пратэстанцкай грамады мелі толькі мужчыны, якія дасягнулі 25 гадоў.

Заканадаўчыя акты, як звычайна, суправаджаліся інструкцыямі і цылкулярамі, якія рэгламентавалі іх выкананне.Ужо праз 4 дні пасля выдання ўказа аб верацярпімасці, 21 красавіка 1905 г. міністэрства юстыцыі выслала сакрэтны цыркуляр губернатарам, граданачальнікам і іншым службовым асобам у якім загадвалася, у адпаведнасці з пунктам 12 указа ад 17 красавіка 1905 г. "Распячатаць" усе малітоўныя дамы, якія былі зачыненыя ў адміністрацыйным парадку"[2, а. 1]. Не падпадалі пад дзеянне гэтага цыркуляра толькі тыя храмы, якія была пабудаваныя з парушэннем будаўнічага статуту.

Разам з тым, згаданым цыркулярам вызначалася, каб адкрыццё малітоўных дамоў праводзілася без урачыстасцяў, якія "могуць стаць спакусай для праваслаўных". У адпаведнасці з гэтым сакрэтным цыркулярам міністэрства юстыцыі, губернатары

давалі сакрэтныя ўказанні паліцмайстрам і павятовым спраўнікам, якія павінны былі пісаць адпаведныя справаздачы на імя губернатараў. Так, напрыклад, віцебскі паліцмайстар дакладаў свайму губернатару, што закрытых малітоўных дамоў, якія б падпадалі пад дзеянне цыркуляра аб адкрыцці малітоўных дамоў, у Віцебску няма [2, а. 4-4зв.]. Тое ж самае адносна Віцебскага павета пісаў і віцебскі павятовы спраўнік [2, а. 5].

Павелічэнне колькасці пратэстантаў, спрыяла ўзрастанню да іх увагі ўладных структур, у тым ліку і з пункту гледжання ідэалогіі. Асабліва цікавіліся ўладамі стаўленнем пратэстантаў (баптыстаў, евангельскіх хрысціян і штундыстаў) да ваеннай службы. 22 лістапада 1911 г. дырэктар Дэпартамента духоўных спраў МУС пісаў віцебскаму губернатару, што ён мае звесткі пра тое, што правіла не браць у рукі зброі з'яўляецца часткай баптысцкага веравучэння. І прасіў паведаміць як да гэтага пытання ставяцца ў баптысцкіх цэрквах на тэрыторыі Віцебскай губерні. Дадзены цыркуляр быў сакрэтны [3, а. 1].

Віцебскі губернатар у сваю чаргу даў прадпісанне паліцмайстрам і паліцэйскім спраўнікам, каб за баптысцкімі цэрквамі быў усталяваны пільны негалосны нагляд для высвятлення ці патрабуюцца ад новых членаў баптысцкіх цэркваў абяцанне не браць у рукі зброю.

Дзвінскі павятовы паліцэйскі спраўнік 31 снежня 1911 г. пісаў віцебскаму губернатару, што ў 4-х станах павета ёсць каля 50 баптыстаў, якія належаць да царквы гораду Якабштат Курляндскай губерні. Паколькі рапарт вельмі цікавы для разумення стаўлення расійскіх улад да баптыстаў, прывядзем некаторыя вытрымкі з дакумента. Як пісаў дзвінскі спраўнік: “У секту баптыстаў прымаюцца асобы не маладзей 18-гадовага ўзросту, і, па наяўных звестках прыём адбываецца наступным чынам: асоба, ахвотная паступіць у секту, звяртаецца з просьбай да настаўніка, апошні абавязвае новага члена вывучаць Біблію, каб у жыцці паступаць паводле яе вучэння. Затым з боку настаўніка і іншых членаў секты напрацягу года ўсталёўваецца патаемнаеназіранне за паводзінамі і ладам жыцця таго, хто выявіў жаданне паступіць у секту. Пасля гэтага тэрміну, калі паступаючы будзе прызнаны годным, ён дапускаецца да воднага хрышчэння, абраду, што здзяйсняецца настаўнікам супольнасці. Прынятаму члену ўнушаецца памятаць і свята выконваць прыказанне “не забі”, але ўжыванне зброі падчас вайны не забараняецца, паколькі згодна з вучэннем Біблії, войнамі кіруе Бог.

Баптысты, якія пражываюць у 4 станах Дзвінскага павету займаюць ніжэйшае грамадскае становішча, і амаль усе перайшлі з лютаранскага веравызнання” [3, а. 9].

Адзначым, што тут паліцмайстар для характарыстыкі адносін унутры баптысцкай царквы карыстаецца паліцэйскай тэрміналогіяй, кшталту “ўсталёўваецца патаемнае назіранне”.

Тады ж дзвінскі паліцмайстар, які адказваў за горад Дзвінск, паведамляў віцебскаму губернатару, што ў Дзвінску ёсць царква баптыстаў колькасцю ў 20 чалавек. Усе яны аддзяліліся ад лютаран. Малітоўнай залы баптысцкая царква на той момант не мела, і запрашала да сабе прапаведніка Яна Янсана з Якабштата. Паводле згаданага рапарта, у дзвінскіх баптыстаў не было адмоўнага стаўлення да ваеннай службы [3, а. 15].

Дрысенскі павятовы паліцэйскі спраўнік у студзені 1912 г. пісаў віцебскаму губернатару, што ў павеце ёсць толькі адна баптысцкая сям'я – 2 мужчыны і 2 жанчыны. Яны былі выхадцамі з Прыбалтыйскага краю - латышамі. Баптысцкімі цэнтрамі Прыбалтыйскага краю ў рапарце названы Рыга, Мітава і Якабштат. У Дрысенскім павеце, паводле павятовага спраўніка, баптызм не распаўсюджваўся [3, а. 17].

У той жа час, віцебскі паліцмайстар паведамляў губернатару, што ў Віцебску, на 1-м Елагскім завулку ў доме Гельвіна жыве кіраўнік баптысцкай царквы Гуга Шэйнгарт, паводле тлумачэння якога баптысцкая царква ў Віцебску з'явілася нядаўна і складалася на той момант з 9 чалавек. Віцебскія баптысты не выступалі супраць ваеннай службы. Дадзеныя словы Г. Шэйнгарта, пацвярджаліся, на думку паліцмайстра, тым, што член Віцебскай баптысцкай царквы Грынвельд у той час служыў у 100-м пяхотным Астроўскім палку, а сам кіраўнік царквы Г. Шэйнгарт служыў у Дзвінскай крапасной артылерыі. Такім чынам, заяўленая пазіцыя Віцебскай царквы была наступнай: прыказанне “не забі” кожны можа тлумачыць як лічыць патрэбным [3, а. 19].

Люцынскі павятовы спраўнік 10 жніўня 1912 г.,пісаў віцебскаму губернатару што баптысты не вядуць прапаганды супраць нашэння зброі, але заклікаюць сваіх прыхільнікаў адмаўляцца ад палення тытуню і ўжывання “моцных напояў” [4, а. 138зв.].

Полацкі і Віцебскі епіскап Мікадзім 6 сакавіка 1912 г. канстатаваў, што баптысты прысутнічаюць у Рэжыцкім, Віцебскім (г. Віцебск) і Дрысенскім паветах, што баптызм у Полацкім павеце развіваецца на глебе лютаранства. Але, пісаў ён, па пытаннях стаўлення да дзяржавы баптысты рэзка адрозніваліся ад лютаран. Галоўнае адрозненне было ў тым, што баптысты не прызнаюць цара Памазаннікам Божым, і не жадаюць плаціць падаткаў грунтуючыся на словах Ісуса Хрыста Мц 17:24-27. Таксама ён пісаў, што некаторыя баптысты адмаўляюць неабходнасць законаў. Там жа архірэй сцвярджаў, нібыта баптысты ўнушаюць новым членам сваіх цэркваў, што вера забараняе карыстацца зброяй. Але публічна яны гэтага не кажуць. Пасля набажэнстваў баптысты маюць нарады, на якіх нікога з пабочных асоб не запрашаюць. Новыя члены на гэтых нарадах "пасвячаюцца ва ўсе таямніцы секты" [3, а. 20].

З дакументаў вынікае, што ўлады не зусім давяралі паведамленням мясцовых чыноўнікаў, і інфармацыі атрыманай ад мясцовых пратэстанцкіх пастараў. Так, 17 красавіка 1912 г. дырэктар Дэпартамента духоўных спраў МУС пісаў віцебскаму губернатару М. Арцымовічу з просьбай падаць звесткі пра колькасць зарэгістраваных, у адпаведнасці з законам ад 17 кастрычніка 1906 г., "сектанцкіх" грамад, пра малітоўныя дамы і пра пераходы з праваслаўя ў евангельскае хрысціянства [4, а. 1]. Дырэктар Дэпартамента духоўных спраў МУС прасіў не афішаваць збор гэтых звестак, каб не "бударажыць сектанцкіх асяродкаў". 17 чэрвеня 1912 г. губернатар выдаў чарговы адмысловы сакрэтны цыркуляр паліцмайстрам і павятовым спраўнікам.

Фактычна адразу віцебскі паліцмайстар рапартаваў губернатару, што "створаная ў горадзе Віцебску секта баптыстаў у гэты час зусім распалася і яе паслядоўнікі ў Віцебску не пражываюць" [4, а. 6].

Справа, аднак, заключалася ў тым, што пачынаючы з 1912 г. у Расійскай імперыі значна пагоршылася сітуацыя са свабодай сумлення. У гэты час узмацніўся ціск на тых, хто перайшоў з праваслаўя ў евангельскае хрысціянства, пачаўся судовы пераслед аднаго з галоўных кіраўнікрў баптыцкага саюза цэркваў Прыбалтыйскага краю В. Фетлера, некаторыя прэсвітары баптысцкіх цэркваў Расіі і Украіны атрымалі турэмныя тэрміны за "совращение из православия" [5, с. 305]. У 1912 г. у Лыскаве каля Пружан быў арыштаваны будучы знакаміты баптысцкі пастар, перакладчык Бібліі на беларускую мову Л. Дзекуць-Малей, паводле звестак С. Пекуна пасля арышту яго прывязалі да конскага сядла і каля 100 км вялі такім чынам аж да Брэста, дзе ён быў змешчаны на 3 месяцы ў турму [6, с. 141]. У 1913 г. быў арыштаваны першы прэсвітар Мінскай баптысцкай царквы Г. Андрухоў [7].

Гэтыя рэпрэсіўныя захады сведчаць пра тое, што ўлады пасля 1912 г. мелі намер у прававым і ідэалагічным плане вярнуць сітуацыю з пратэстанцкімі цэрквамі на ўзровень, які існаваў да 17 красавіка 1905 г.

Такім чынам, канфесійнае прававое поле Расійскай імперыі, якое значна лібералізавалася пад уплывам рэвалюцыйных падзей 1905 г. стала значна больш спрыяльным для дзейнасці пратэстанцкіх цэркваў, чым у папярэдні перыял. Расійскія ўлады асабліва цікавіліся стаўленнем баптыстаў, евангельскіх хрысціян і штундыстаў да пытання ваеннай службы і ўдзелу ў баявых дзеяннях. Нягледзячы на тое, што паведамленні чыноўнікаў і служыцеляў пратэстанцкіх цэркваў сведчылі аб тым, што пратэстанты не былі пацыфістамі, поўнага даверу да гэтай інфармацыі ўлады не мелі. Тым больш, што пэўная негатыўная інфармацыя адносна пратэстантаў ішла з боку асобных прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства. А пасля 1912 г. у многіх выпадках улады вярнуліся да рэпрэсіўных захадаў у адносінах да пратэстанцкіх служыцеляў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Кривицкий М.А. Предпосылки распространения баптизма на территории Беларуси (1905–1914 гг.) // Архіварыус. Выпуск 12. Мінск, 2014. С. 253–279. С. 256.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). Ф. 1430. В. 1. С. 46983.
3. НГАБ. Ф. 1430. В. 1. С. 48020.
4. НГАБ. Ф. 1430. В. 1. С. 48280.
5. Савинский С.Н. Итсория евангельских христиан-баптистов Украины, России и Белоруссии (1867-1917). Санкт-Петербург: Библия для всех, 1999. С. 305.
6. Пекун С. Дукаш Дзекуць-Малей: жыцьцё і служэньне / Лукаш Дзекць-Малей і беларускія пераклады Бібліі: зб. матэрыялаў, арт. і дак. Брэст: Альтэрнатыва, 2011. С. 141.
7. Бондарь Д. 105 лет Минской церкви ЕХБ // Крыніца жыцця. 2011. №1. С. 18.